УДК 069.12(476)"1930"

# ФОРМЫ І МЕТАДЫ РАБОТЫ САВЕЦКІХ МУЗЕЯЎ З АЎДЫТОРЫЯЙ У 1930-Я ГГ.

***І. Г. Лупашка,***
*кандыдат культуралогіі, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаюцца формы і метады работы савецкіх музеяў з аўдыторыяй у 1930-я гг. Крыніцазнаўчай базай даследавання абраны часопіс «Советский музей» як галоўны прафесійны часопіс музейшчыкаў таго перыяду. Робіцца выснова, што асартымент музейных прапаноў быў даволі шырокім, усведамлялася неабходнасць індывідуальнага і дыферэнцыраванага падыходу да розных катэгорый наведвальнікаў. Асаблівая ўвага надаецца аналізу работы музеяў са школьнікамі.

**Ключавыя словы:** савецкія музеі, музейная аўдыторыя, формы і метады, інтэрактыўнасць, наведвальнікі.

# FORMS AND METHODS OF WORK WITH AUDIENCES IN SOVIET MUSEUMS IN THE 1930S

***I. Lupashka,***
*PhD in Culturology, Associate Professor, Associate Professor of Department of Historical and Cultural Heritage of the Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article examines the forms and methods of work of Soviet museums with the public in the 1930s. The journal «Soviet Museum» was chosen as the source scientific basis for the study as the main professional journal of museum workers of that period. The author concludes that the range of museum offerings was quite wide and recognizes the need for an individual and differentiated approach to different categories of visitors. Particular attention is paid to the analysis of the work of museums with schoolchildren.

**Keywords:** Soviet museums, museum audience, forms and methods, interactivity, visitors.

Пытанні ўзаемадзеяння музеяў з аўдыторыяй не страчваюць сваёй актуальнасці з таго часу, калі музеі сталі публічнымі і даступнымі. Аднак сістэма ўзаемадзеяння з аўдыторыяй, эфектыўныя формы і метады складаліся не адразу. Разгледжаны ў артыкуле перыяд адносіцца да этапу палітызаванай мадэлі музеяў. Найбольш дакладна адлюстроўваюца функцыі і задачы савецкага музея ў 1930-я гг. у рэзалюцыі Першага Усерасійскага музейнага з’езда: «Необходимо установить форму музея как части политпросветкомбината» [5, с. 668]. Гэтым абумоўлены і змест музейнай работы. Тэрміналогія, якая апісвае ўзаемадзеянне музеяў з аўдыторыяй, у гэты перыяд змяняецца і гучыць як палітыка-асветная, масавая работа.

З другога боку, згаданы перыяд характарызуецца актыўным станаўленнем сістэмы мэтанакіраванага ўзаемадзеяння савецкіх музеяў з аўдыторыяй, значным пашырэннем форм і метадаў работы. У вышэйназванай рэзалюцыі зафіксаваны формы агітацыі за музей, формы масавай пазамузейнай работы, формы масавай работы непасрэдна ў музеі.

Асноўнай трыбунай і пляцоўкай для абмену прафесійным вопытам стаў часопіс «Советский музей», які з’яўляецца асноўнай крыніцазнаўчай базай нашага даследавання [1–4; 6–8]. Рэтраспектыўны аналіз паказвае, што згодна з патрабаваннямі часу ў большасці музеяў назіраецца асаблівая ўвага да палітыка-асветнай работы, аднак актыўнасць у гэтым кірунку залежыць у тым ліку і ад такіх фактараў як месцазнаходжанне музея, колькасць штатных супрацоўнікаў і ініцыятыўнасць на месцах. Пераважна сваім вопытам дзеляцца музеі Масквы і Ленінграда.

Да 1930-х гг. асноўнай формай масавай музейнай работы стала экскурсія. Задачай на далейшы этап было пастаўлена «изживание случайных экскурсий для организованных групп. Необходимо бороться за тематичность и цикличность экскурсий» [5, с. 668]. Вырашэнне гэтых пытанняў бачылася ў тым ліку ў актыўным узаемадзеянні са школай. Вылучаліся экскурсіі «школьныя» (вучэбна-праграмныя, экскурсіі-ўрокі), якія распрацоўваліся адпаведна са школьнай праграмай і ўваходзілі ў так званы «экскурсмінімум», і «пазашкольныя», якія павінны былі арыентавацца на асабістыя інтарэсы вучняў і абумоўліваліся тэмай музея [1; 4]. Невыпадкова, што асноўная катэгорыя музейнай аўдыторыі ў азначаны перыяд – школьнікі (як арганізаваныя, так і адзіночныя наведвальнікі).

Звернемся да вопыту музейна-выставачнай работы з дзецьмі, апісанага Я. Мексіным [3]. Нягледзячы на тое, што, па словах аўтара артыкула, «музеи терпят от детского зрителя изрядное беспокой-

ство», сцвярджаецца, што «музеи обязаны немедленно поставить на очередь актуальнейший вопрос об улучшении обслуживания детей». Робіцца слушная выснова аб небходнасці стварэння спецыяльнай методыкі музейна-выставачнай работы з дзіцячым гледачом, якая разглядаецца як перадумова стварэння спецыяльных дзіцячых музеяў. Новыя для таго часу формы і метады работы са школьнікамі былі апрабіраваны на некалькіх дзіцячых выставах: «Для детей про зверей», «Что чем движется», выстава дзіцячай японскай кнігі, выстава дзіцячай савецкай кнігі. Аўтары выстаў зыходзілі з таго, што «детям свойственна и приятна динамика». Напрыклад, на выставе «Для детей про зверей» былі арганізаваны «гульні і забавы», дзе скульптар вырабляў з гліны фігуркі жывёл, тлумачачы дзецям працэс. Самастойна дзеці маглі змайстраваць цацку з пап'е-машэ, паперы, размаляваць ці склеіць маску [3]. Згодна з сённяшняй тэрміналогіяй мы можам абазначыць гэтую форму работы як майстар-клас.

Актыўна выкарыстоўваліся падчас знаёмства з дзіцячымі выставамі гульнёвыя метады. Напрыклад, на некалькіх выставах экскурсантам прапаноўваліся карткі з пытаннямі, на якія трэба было знайсці экспанаты-адказы. Існавалі розныя ўзроўні складанасці, ужываліся метады спаборніцтва з пошукам адказаў на хуткасць.

Метады актывізацыі наведвальніка былі распрацаваны і для выставы дзіцячай кнігі. У спецыяльнай зоне дзецям трэба было сярод падрыхтаваных этыкетак знайсці кнігі, да якіх яны адносяцца. Яшчэ адна магчымасць адчуць сябе музейшчыкам была ў інтэрактыўнай зоне «Зрабі выставу сам», дзе прапаноўвалася адабраць для выставы кніжныя ілюстрацыі і зрабіць экспазіцыю.

Цікава, што для разгледжаных выстаў быў створаны шэраг спецыяльных інтэрактыўных экспанатаў. Сярод іх – «Шкаф превращений», «Детиздат», «Угадай откуда», «Что я читал». Напрыклад, у шафе пераўтварэнняў знаходзіўся манекен, якога трэба было апрануць у касцюм пэўнага героя дзіцячай літаратуры. «Детиздат» – невялічкая дзіцячая тыпаграфія, дзе па ўзоры наведвальнікі маглі самі надрукаваць ліст Н. К. Крупскай да піянераў і школьнікаў аб значэнні дзіцячай кнігі, запрашальны білет на выставу для сваіх сяброў, урыўкі з мастацкіх твораў М. Горкага і А. Пушкіна, партрэты дзяржаўных дзеячаў, гравюры на дрэве і лінолеуме.

Інтэрактыўная зона была арганізавана на выставе «Для детей про зверей». У цэнтры залы быў размешчаны спецыяльны стол з надпісам «Тут усё можна кранаць рукамі», які карыстаўся вялікай папулярнасцю ў наведвальнікаў.

Яшчэ адна форма ўзаемадзеяння з дзецьмі – выяўленне актыву і арганізацыя з яго дапамогай дзяжурстваў і кансультацый па выставе. Звычайна на кожнага дзяжурнага адводзіўся невялікі раздзел экспазіцыі, па якім ён валодаў неабходнай інфармацыяй. З аднаго боку, гэта сведчыць аб недахопе кваліфікаваных кадраў. З другога – міжасабовая камунікацыя дзяцей аднаго ўзросту часта з'яўляецца даволі эфектыўнай і выкарыстоўваецца ў сучаснай педагогіцы як метад «роўны – роўнаму».

Значную ўвагу надае аўтар артыкула і тэатралізацыі ў музейнай справе, паколькі яна выклікае вялікі эмацыянальны водгук, аднак адназачае, што «соблюдаем величайшую осторожность и не торопимся заимствовать готовые театральные формы» [3].

Падагульняючы вопыт працы дзіцячых выстаў, іх аўтары заўважаюць, што «методическим стержнем выставочного режима является детская самодеятельность. Каждый посетитель … вовлекается в творческие процессы: познавательные, эмоциональные и моторные» [3, с. 53].

Заслугоўвае асобнай увагі артыкул «Работа музеев со школьником-одиночкой», які абагульняе вопыт маскоўскіх музеяў [2]. Аўтар вылучае дзве катэгорыі школьнікаў, якія прыйшлі ў музей не ў складзе арганізаванай групы: школьнікі, якія прыйшлі ўпершыню пазнаёміцца з музеем; школьнікі, якія прыйшлі ў музей з пэўным заданнем. Для другой катэгорыі вылучаюцца падгрупы: наведвальнікі, які шукаюць матэрыял для выканання разавага школьнага задання; якія рыхтуюцца да іспытаў, паўтараючы школьны курс на экспанатах музея; для паглыблення і праверкі школьных ведаў па асабістай ініцыятыве; наведвальнікі з паглыбленай цікавасцю да пэўнай галіны ведаў.

У артыкуле аналізуюцца чатыры асноўныя формы работы музеяў са школьнікамі-адзіночкамі. Першая з іх: арганізацыя з адзінкавых наведвальнікаў экскурсійных груп. Адзначаецца, што ў асобных музеях (напрыклад, Музеі рэвалюцыі) экскурсію праводзілі не па стандартным маршруце, а ўлічваючы асабістыя інтарэсы наведвальнікаў. Гэта, на наш погляд, сведчыць аб разуменні значнасці індывідуальнага і дыферэнцыраванага падыходаў у музейнай дзейнасці. Другая форма – кансультацыя. У некаторых музеях для гэтага ствараліся «куткі школьніка», ці «куткі кансультацый», або ўстанаўлівалася дзяжурства навуковага супрацоўніка па пэўным аддзеле. Вялікую цікавасць выклікае трэцяя форма – «маршруты». Згодна з яе апісаннем, яна можа разглядацца як правобраз сучаснай папулярнай формы – квэст. Прыводзіцца некалькі прыкладаў «маршрутаў». Аснова іх – папяровы маршрутны ліст з разнастайнымі пытан-

нямі, на якія трэба самастойна знайсці адказы ў экспазіцыі. Напрыклад, Музей выяўленчых мастацтваў распрацаваў пяць скразных (аглядных. – *І. Г.*) маршрутаў для школьнікаў старэйшага ўзросту, Музей рэвалюцыі прапаноўваў пяць тэматычных маршрутаў, разлічаных на малодшы школьны ўзрост, Гістарычны музей – тры маршруты на тэмы, якія мелі найбольшую папулярнасць у наведвальнікаў: адзенне, жыллё і зброя. Аўтар адзначае вялікі патэнцыял гэтага пачынання і рэкамендуе перанесці такі вопыт на ўсе музеі для павелічэння спосабаў актывізацыі наведвальнікаў. Чацвёртая форма работы – гурткі пры музеях. Прыводзяцца прыклады шэрагу музейных гурткоў рознай накіраванасці: мастацтвазнаўчыя, біялагічныя, вынаходніцкія і інш. [2]. З артыкула вынікае, што музейшчыкамі ўсведамлялалася неабходнасць фарміравання пастаяннай музейнай аўдыторыі, і гурткі разглядаліся як адна з эфектыўных форм у гэтым кірунку.

Сярод іншых форм у гэты перыяд вылучаюцца лекцыі, сустрэчы, мастацкі расповед з наступнай экскурсіяй, тэматычны кінапрагляд, дзень школьніка, музейны фестываль у час канікул, краязнаўчая эстафета і інш.

Яшчэ адна адметнасць разгледжанага перыяду – пашырэнне музейнай аўдыторыі за кошт далучэння калгаснікаў, якія ў той час вылучаліся як асобная катэгорыя. Сярод спосабаў, якія выкарыстоўваліся: заключэнне дагавораў з калгасамі на экскурсійнае абслугоўванне, адпраўленне лістоў і тэлефанаграм у сельсаветы і калгасы з тлумачэннем задач музея, артыкулы ў газетах, выступленні на радыё, агітплакаты, выезды ў вёску [6].

Значная колькасць музеяў мелі распрацаваны цыкл лекцый, гутарак, чытанняў, перасоўных выстаў, з якімі выязджалі ў вёску. Арганізоўваліся і масавыя выезды калгаснікаў у горад: «колхозные экскурсии прибывали в музей целыми обозами, с красными флагами, с бубенцами на дугах лошадей, с песнями и музыкой». Звычайна такі выезд прадугледжваў камбінiраваную культурную праграму. Адзін з апісаных выездаў у Арэхава-Зуева ўключаў кароткі мітынг, экскурсіі ў музеі і іншыя культурныя і прамысловыя ўстановы, прагляд п’есы ў рабочым тэатры [6, с. 37].

Такім чынам, нягледзячы на залішне палітызаваны змест музейнай дзейнасці, асартымент форм і метадаў работы з аўдыторыяй быў даволі шырокім, усведамлялася неабходнасць індывідуальнага і дыферэнцыраванага падыходу да розных катэгорый наведвальнікаў. Многія формы і метады выкарыстоўваюцца музеямі да сённяшняга часу ці трансфармаваліся ў больш сучасныя варыянты.

*1. Козлова, О.* Как проводить экскурсию школьников в музее / О. Козлова // Совет. музей. – 1940. – № 3 – С. 4–10.

*2. Кордес, В.* Работа музея со школьником-одиночкой / В. Кордес // Совет. музей. – 1936. – № 4. – С. 58–64.

*3. Мексин, Я.* Из опыта музейно-выставочной работы с детьми / Я. Мексин // Совет. музей. – 1932. – № 2. – С. 38–57.

*4. Мексин, Я.* Экскурсионная работа в музее / Я. Мексин // Совет. музей. – 1935. – № 2. – С. 21–30.

*5.* Первый Всероссийский музейный съезд // Музеевед. мысль России XVIII – XX веков : сб. док. и материалов / отв. ред. Э. А. Шулепова. – М., 2010. – С. 637–670.

*6. Полякова, Е. М.* Опыт работы музеев Московской области с колхозниками / Е. М. Полякова // Совет. музей. – 1936. – № 4. – С. 36–42.

*7. Радченко, Е. С.* Музей и школа / Е. С. Радченко // Совет. музей. – 1932. – № 5. – С. 3–14.

*8. Романов, М.* Политико-просветительская работа районного краеведческого музея / М. Романов // Совет. музей. – 1940. – № 2. – С. 30–32.